# ФАРМІРАВАННЕ ПАТРЫЯТЫЗМУ МАЛАДОГА ПАКАЛЕННЯ СРОДКАМІ ЭКАЛАГІЧНАГА ТУРЫЗМУ

**А. М. Нароўская,** *кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Патрыятычнае выхаванне моладзі – гэта дзейнасць, накіраваная на духоўнае і фізічнае развіццё, на фарміраванне светапогляду, маральных адносін да традыцый свайго народа, любові да Радзімы [3, с.38–41]. Працэс патрыятычнага выхавання ў экалагічным турызме звернуты да эмоцый асобы, пры гэтым моладзь выпрацоўвае сваё стаўленне да праблем экалогіі і абароны навакольнага свету.

Турызм як крыніца інфармацыі можа аказаць істотны ўплыў на фарміраванне патрыятычных пачуццяў студэнтаў. Важнай умовай пры гэтым павінна быць тое, што студэнты, якія набываюць веды на лекцыях, семінарскіх занятках, замацоўваюць іх падчас экскурсій, падарожжаў па Беларусі, якія выкладчыкі кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства праводзяць штогод. За апошнія некалькі гадоў выкладчыкамі былі арганізаваны экскурсіі ў Мірскі замак, Нясвіжскі палацава-паркавы комплекс, Косаўскі замак, палац у Ружанах, Гомельскі палацава-паркавы ансамбль і інш. У час падарожжаў па краіне студэнты прымаюць актыўны ўдзел у правядзенні экскурсій. Яны рыхтуюць кароткія экскурсы па асобных архітэктурных і прыродных аб’ектах. Напрыклад, у час наведвання г. Слоніма студэнты падрыхтавалі інфармацыю пра касцёл Св. Андрэя, гісторыю сінагогі, канал Агінскага; у г. Ружаны Пружанскага р-на і г. Косава Івацэвіцкага р-на Брэсцкай вобласці – расказалі пра Ружанскі палац і Косаўскі замак (вядомы як палац Пуслоўскіх), адзначылі асаблівасці Ружанскага палаца, які з’яўляўся адным з буйнейшых палацавых комплексаў Беларусі XVII–XVIII стст. і быў рэзідэнцыяй князёў Сапегаў, распавялі пра архітэктара Я. Бэкера, які спраектаваў прамяністы парк з каналамі, вадаёмамі, павільёнамі і ліпавымі алеямі. Цікавыя звесткі былі падрыхтаваны пра ўнікальны палацава-паркавы ансамбль Пуслоўскіх з яго тэраснымі аранжарэямі і фантанамі.

Трэба адзначыць, што пры фарміраванні іміджу тэрыторыі як аб’екта экалагічнага турызму асаблівую ўвагу неабходна надаваць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гістарычным і культурным падзеям мінулага, канкрэтным асобам, якія ўнеслі ўклад у іх развіццё і пакінулі аб сабе памяць. Экалагічны турызм неабходна праводзіць на лепшых аб'ектах культурна-гістарычнай і прыроднай спадчыны, што дазваляе фарміраваць не толькі эстэтычныя густы, але і патрыятычны светапогляд. У час экскурсіі, напрыклад, у адноўлены Мемарыяльны музей-сядзібу Т. Касцюшкі студэнты знаёмяцца з жыццём і дзейнасцю нашага суайчынніка ў Беларусі і за яе межамі. Вядома, што Тадэвуш Касцюшка з'яўляецца не толькі героем Беларусі, але і Польшчы, Злучаных Штатаў Амерыкі, Францыі, Аўстраліі, нават Швейцарыі. Зразумела, усё гэта спрыяе фарміраванню ў моладзі пачуцця гонару за нашага суайчынніка, годнасці як грамадзяніна нашай краіны.

Неабходнай умовай фарміравання патрыятызму з'яўляецца і тое, што экалагічныя веды ў студэнтаў пераўтвараюцца ў экалагічнае мысленне, у маральныя перакананні, у нормы і прынцыпы грамадзянскай адказнасці за цяперашні і будучы стан прыроднага асяроддзя [2]. Такія веды ў студэнтаў замацоўваюцца падчас лекцый па курсе «Ахова гісторыка-культурнай спадчыны», дзе разглядаюцца пытанні, звязаныя з фарміраваннем спіса аб'ектаў прыроднай і культурнай спадчыны, з захаваннем паркаў і аховай навакольнага асяроддзя. Акрамя лекцый, студэнты наведваюць экспазіцыі Дзяржаўнага музея экалогіі і прыроды Рэспублікі Беларусь, музея валуноў, музея землязнаўства БДУ, заалагічнага музея БДУ, дзе бачаць лепшыя ўзоры, створаныя прыродай, і засвойваюць інфармацыю аб захаванні гэтай прыгажосці для нашчадкаў. Пасля заканчэння ВНУ выпускнікі, якія набылі веды і экалагічнае мысленне, шмат падарожнічалі па Беларусі, змогуць прыняць актыўны ўдзел у развіцці экалагічнага турызму ў нашай краіне.

Развіццю экалагічнага турызму як сродку патрыятычнага выхавання моладзі могуць спрыяць распрацоўка і ўкараненне прагрэсіўных тэхналогій турысцкага абслугоўвання, удасканаленне сістэмы інфармацыйнага забеспячэння ў розных СМІ (друк, радыё, тэлебачанне, Інтэрнэт), а таксама правядзенне актыўнай рэкламнай кампаніі, накіраванай на фарміраванне іміджу тэрыторый.

Экалагічны турызм можа ажыццяўляцца ў кожным з шасці рэгіёнаў Беларусі і павінен выкарыстоўваць свой патэнцыял для выхавання моладзі як грамадзян, патрыётаў сваёй краіны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пры фарміраванні стратэгіі экалагічнага турызму неабходна ўлічваць патэнцыял малых гістарычных горадоў, спажыванне якога патрабуе невялікіх выдаткаў. Сёння студэнты кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства ў час летніх канікул самастойна наведваюць такія гарады, як Навагрудак, Нясвіж, Лагойск, Гродна, Віцебск, Заслаўе, дзе знаёмяцца з забудовамі гістарычных цэнтраў і прыроднымі асаблівасцямі рэгіёнаў. Гэта сведчыць пра цікавасць моладзі да нашай гістарычнай і культурнай спадчыны.

Экалагічны турызм як крыніца дакладнай і нагляднай інфармацыі можа аказаць істотны ўплыў на фарміраванне патрыятычных пачуццяў. Гэты від турызму ажыццяўляецца ў пэўным прасторавым асяроддзі, выкарыстоўваючы прыродна-кліматычны патэнцыял мясцовасці, а для гэтага неабходны стварэнне баз даных па экалагічных маршрутах (запаведнікі, гістарычныя паркі), будаўніцтва спецыяльных аб'ектаў, такіх, як, напрыклад, нацыянальныя вёскі і інш. [1, с.21–30].

Паколькі экалагічны турызм уносіць пэўны ўклад у эканоміку рэгіёна, мясцовай уладзе пажадана гэты від турызму ўключыць у праграму сацыяльна-эканамічнага развіцця. Пры фарміраванні праграм экалагічнага турызму неабходна ўлічваць матывы, патрэбнасці і магчымасці патэнцыйных турыстаў (матэрыяльныя, узроставыя) [4, с.52–67]. Выкарыстанне экалагічных рэсурсаў рэгіёнаў Беларусі дазволіць папулярызаваць унутраны турызм.

Такім чынам, любы від турызму, у тым ліку экалагічны, можа вырашаць праблему патрыятычнага выхавання моладзі, бо ён валодае магчымасцю дэманстрацыі аб’ектаў культурнага і гістарычнага характару, працякае ў пэўным навакольным асяроддзі, спрыяе фарміраванню экалагічнага і патрыятычнага мыслення моладзі.

---


1. *Азар, В.И.* Методологическое введение к программам регионального туристского развития / В.И. Азар // Труды Академии туризма. – СПб. : ОЛБИС, 1995. – Вып. 1. – С. 21–30.

2. *Буторина, Л.А.* Воспитание патриотизма средствами образования / Л.А. Буторина. – М. : Каро, 2005. – 224 с.

3. *Белоусов, Н.А.* Патриотическое воспитание студентов как проблема педагогического образования / Н.А. Белоусов, Т.Н. Белоусова // Патриотическое воспитание : история и современность : сб. науч. ст. – Минск : Белорус. гос. пед. ун-т им. М. Танка, 2004. – С. 38–41.

4. *Гуляев, В.Г.* Организация туристской деятельности / В.Г. Гуляев. – М. : Нолидж, 2005. – 144 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ